# Круглы стол з кіраўнікамі: уклад прадпрыемстваў і планы на будучыню

13 жніўня 2025 года адбыўся круглы стол з удзелам кіраўнікоў полацкіх прадпрыемстваў і кіраўніка РУП "Полацкі ЦСМС" на тэрыторыі ААТ "Полацкі камбінат хлебапрадуктаў". Прысутнічаў 31 кіраўнік прадпрыемстваў і арганізацый горада.

Сярод спікераў пасяджэння прысутнічалі: старшыня, дырэктар выканаўчай дырэкцыі Віцебскага абласнога саюза наймальнікаў, намеснік начальніка ўпраўлення эканомікі Полацкага райвыканкама, дырэктар РУП "Полацкі ЦСМС", прадстаўнікі гарадскіх СМІ, і інш.
Узняты да абмеркавання такія пытанні як:

сацыяльна-эканамічнае развіццё полацкага рэгіёна, уклад прадпрыемстваў у развіццё і шляхі ўдасканалення сумеснай работы;
рэалізацыя інвестыцыйнай праграмы "Адзін раён - адзін праект" (на прыкладзе прадпрыемства СТАА "Наваполацкі завод тэхналагічных металаканструкцый", праект будзе завершаны да канца 2025 года), мадэрнізацыя і будаўніцтва новых аб'ектаў (сацыяльна-значныя аб'екты, будаўніцтва аўтацэнтра Белджы ў г.Полацк, рэканструкцыя моста, пажарнай часткі і інш.
развіццё прадпрымальніцкага сектара, прыярытэты для рэгіёну ў рэалізацыі інвестыцыйнага праекта "Рэгіянальная ініцыятыва". Напрыклад, праект рэалізацыі вытворчасці па выпуску бензапіл, камплектуючых і іншага бензаінструмента ТАА "Лесдрэўкансалт" г.Полацк, уключаны ў праграму ў чэрвені бягучага года, не толькі створыць новыя віды прадукцыі, але і прыцягне фінансавыя рэсурсы ў Полацкі рэгіён і будзе садзейнічаць стварэнню новых рабочых месц;
пашырэнне пераліку гандлёвых партнёраў, умацаванне супрацоўніцтва з Расійскай федэрацыяй;
пяцігодка якасці і бяспеку прадукцыі ў сучасных умовах. Праца РУП «Полацкі ЦСМС» у гэтым напрамку.

Дырэктарам Полацкага цэнтра стандартызацыі былі агучаны ключавыя аспекты інфраструктуры якасці ў Рэспубліцы Беларусь, абазначаны вектары развіцця стандартызацыі, метралогіі, ацэнкі адпаведнасці, выпрабавальнага патэнцыялу. Даведзена інфармацыя аб матывацыі выпуску прадпрыемствамі рэгіёну якаснай прадукцыі і паслуг (аб конкурсным руху), аб уступленні ў тэхнічныя камітэты і пераглядзе тэхнічных умоў.

У рамках сустрэчы выказана пазіцыя ўзаемных зносін і дапамогі ў вырашэнні задач па павышэнні якасці і канкурэнтаздольнасці прадпрыемстваў, у тым ліку па метралагічнаму забеспячэнню і аснашчэнню вытворчасцей, выпрабаванню прадукцыі, стандартызацыі і ацэнкі адпаведнасці, сістэмнаму менеджменту.

У рамках дзелавой сустрэчы адбылася дэманстрацыя асартыменту прадукцыі ААТ "Полацкі камбінат хлебапрадуктаў", у 2024 годзе прадпрыемства стала лаўрэатам конкурсу "Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь" (у намінацыі "Харчовыя тавары" - мука пшанічная вышэйшага гатунку М54-25). Напрыканцы сустрэчы адбылася экскурсія па цэхах камбіната, у рамках якой асабліва цікавым стала наведванне элеватара, які адказвае за прыёмку і захоўванне збожжа на прадпрыемстве. Гэты будынак з'яўляецца самай высокай кропкай у горадзе Полацку.

Мерапрыемства стала важнай пляцоўкай для абмену вопытам і меркаваннямі паміж кіраўнікамі прадпрыемстваў і цэнтра, што будзе садзейнічаць павышэнню эфектыўнасці ўзаемадзеяння.